РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
6 МАЯ 2025 г. АЎТОРАК № 86 (30474)

# «ВЯЛІКАЯ ПЕРАМОГА І ЗАХАВАННЕ ПАМЯЦІ ПРА ЯЕ — ЧАСТКА НАШАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ»

**Чаму героям нашага часу трэба памятаць герояў мінулага**

Фота БелТА.



Аляксандр Лукашэнка ўручае дзяржаўную ўзнагароду начальніку 21-га пагранатрада пагранічнай службы Сяргею Саўчуку.

(Працяг на стар. 2–3)

ПЕРСПЕКТЫВА

## ЭПОХА ДВУХ ІНТЭЛЕКТАЎ

**Як нейрасеткі зменяць наша жыццё?**



Ёсць літаратурная алегорыя аб тым, што робіць чалавека чалавекам, вылучаючы з жывёльнага свету. Уявіце дзве глыбокія студні. У адной — вада цёмная і непразрыстая, у другой — такая ж, але на дне ляжыць уключаны ліхтарык... Шматлікія стагоддзі «лідары меркаванняў» — пісьменнікі, святары, філосафы — сцвярджалі: святло гэтае — чалавечая душа. Сёння, калі з'явіўся трэці аб'ект для параўнання, узнікае пытанне: «А што, калі гэты самы «ліхтарык» — аб'ём інфармацыі, які здольныя апрацаваць і пераўтварыць нейронныя сеткі (бо нейрасеткай можна назваць і чалавечы мозг)?» Ці з'яўляецца штучны інтэлект асобай? Якія небяспекі тоіць у сабе імклівае развіццё нейрасетак? І што чакае нас у будучыні? Пра гэта мы спыталі ў доктара навук, загадчыка лабараторыі матэматычнай кібернетыкі Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі Аляксандра ТУЗІКАВА.

СТАР. 6–7




БАЯВЫЯ ШЛЯХІ СМАЛЯВІЧЧЫНЫ 8–9



ЕС НА ЭНЕРГАПРЫВЯЗІ 11



ІНФАРКТЫ І ІНСУЛЬТЫ «МАЛАДЗЕЮЦЬ» 15

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

TikTok

ISSN 1990 — 763X

# «ВЯЛІКАЯ ПЕРАМОГА І ЗАХАВАННЕ ПАМЯЦІ ПРА ЯЕ — ЧАСТКА НАШАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ»

## Чаму героям нашага часу трэба памятаць герояў мінулага

Прыгожая і ўрачыстая цырымонія прайшла ў Палацы Незалежнасці. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды найлепшым прадстаўнікам розных сфер з усёй краіны. Гэта ўжо стала добрай беларускай традыцыяй — напярэдадні самых значных дат адзначаць тых, хто сваёй штодзённай працай робіць Беларусь лепшай і садзейнічае яе росквіту.



Як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, гэта цырымонія ўзнагароджання глыбока сімвалічная, асаблівая. Яна прымеркавана да свяшчэннай даты — 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. «Дзякуючы беспрэцэдэнтнай мужнасці і адзінству савецкага народа завяршылася самая страшная, самая крывавая, самая маштабная вайна ў гісторыі чалавецтва. Завяршылася поўным разгромам фашызму, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Для Беларусі гэта Вялікая Перамога і захаванне памяці пра яе — частка нашай нацыянальнай ідэі. Акупаваная, змучаная ворагам, але нескораная рэспубліка-партызанка, рэспубліка-падпольшчыца заплаціла за сваё мірнае неба вялізную цану, страціўшы кожнага трэцяга.

**Подзвіг герояў назаўжды застанецца найвялікшым прыкладам самаахвярнай любові да Радзімы. Прыкладам, на якім мы выхоўваем дзяцей, працягваючы традыцыі, атрыманыя ў спадчыну ад доблеснага пакалення пераможцаў».**

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што многія айчынныя прамысловыя гіганты — «Беларуськалій», МТЗ, МАЗ, БелАЗ — вядуць сваю гісторыю, пачынаючы з пасляваеннага часу. «Гэту спадчыну мы не проста захавалі, але прымножылі і ператварылі ў вядомыя беларускія брэнды», — адзначыў ён.

**Прэзідэнт падкрэсліў, што восем мірных дзесяцігоддзяў мінула, а нас правяраюць на трываласць практычна штодзень. І людзі ў пагонах увесь час на баявым пасту. Таму сярод узнагароджаных ордэнамі і медалямі як заўсёды нямала прадстаўнікоў нашага сілавога блока. «Пра вашы подзвігі публічна не кажуць часам. Але я хачу, каб усе ведалі: вы, хлопцы, — героі. Дзякуй за службу», — адзначыў беларускі лідар.**

Сярод тых, хто ўдастоены дзяржаўных узнагарод, — кіраўнікі рэгіёнаў і вядомых айчынных прадпрыемстваў, чыю прадукцыю ведаюць і любяць не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. «Сёння мы ўшаноўваем і нашых аграрыяў. Кіраўнікоў перадавых гаспадарак, якія ўжо цяпер паказваюць, як можна жыць і працаваць у вёсцы будучыні. Ваш досвед нашай краіне вельмі карысны, — адзначыў Прэзідэнт. —

**— Але, вядома, будучыні няма без тых, хто працуе ў навуцы і адукацыі. Вы адказваеце не толькі за падрыхтоўку высакакласных спецыялістаў, але і за тое, каб адкрыцці і напрацоўкі як мага хутчэй укараняліся ў вытворчасць і прыносілі карысць нашай эканоміцы».**

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, за магчымасць ганарыцца сучаснымі дасягненнямі, за захаванне традыцый мы павінны падзякаваць нашым доблесным ветэранам працы. «Вашы мудрыя парады, актыўная жыццёвая пазіцыя неацэнныя і дапамагаюць вырашаць многія задачы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Беларускі лідар заўважыў, што многаму навучыў і многае паказаў грандыёзны па задуме і выкананні праект «Марафон адзінства». За некалькі месяцаў арганізатары і ўдзельнікі праехалі ўсю краіну з вялікімі канцэртамі, тэматычнымі выстаўкамі і дыялогавымі пляцоўкамі.

**«Дарагія сябры! Я вельмі хачу, каб сённяшні дзень не стаў фінішным п'едэсталам, а ператварыўся для вас і вашых калектываў у пункт адліку на шляху да новых здзяйсненняў, — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да герояў дня. — Не час сёння спачываць на лаўрах. Атрымліваючы ўзнагароды напярэдадні 80-годдзя Вялікай Перамогі, памятайце аб тых героях, дзякуючы якім мы жывём».**

Прэзідэнт павіншаваў усіх з надыходзячым святам, пажадаў моцнага здароўя, шчасця і мірнага неба над галавой. «Вельмі хацелася б мне сустрэцца з вамі ў гэтай зале ў чарговы раз, а можа, і не аднойчы», — падзяліўся беларускі лідар.





**У тэму**

## Сакрэт поспеху просты: каманда, працавітасць і дысцыпліна

### ПАЗНАЁМІЛІСЯ БЛІЖЭЙ З НЕКАТОРЫМІ ЎЗНАГАРОДЖАНЫМІ

**Намеснік старшыні Следчага камітэта, генерал-маёр юстыцыі Анатоль ВАСІЛЬЕЎ** узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» III ступені. «Мы памятаем і ведаем нашых дзядоў і прадзедаў, якія абаранялі Радзіму. І сапраўды, як гаворыць Прэзідэнт, калі забыцца пра гэта, то разбурыцца ўсё. Важна захоўваць гістарычную памяць. Важна добра працаваць на сваім рабочым месцы, служыць сваёй Радзіме. Калі трэба, мы будзем яе абараняць да канца», — падкрэсліў ён.

Сярод узнагароджаных — мытнікі, якія знайшлі ў машыне на граніцы буйную партыю ўзрыўчаткі. Нагадаем, што 6 красавіка Дзяржаўны мытны камітэт паведаміў аб спыненні ўвозу на тэрыторыю ЕАЭС найбуйнейшай у гісторыі краіны партыі выбуховага рэчыва. Медалі «За адзнаку ў ахове дзяржаўнай граніцы» Прэзідэнт уручыў **старшаму інспектару аддзела праваядзення аперацый мытнага кантролю Брэсцкай мытні Дзмітрыю ВАЛЧКОВІЧУ і старшаму інспектару аддзела мытных аперацый і кантролю № 1 мытнага паста «Варшаўскі мост» Брэсцкай мытні Дар'і САВІЧ.**



Адзначаныя мытнікі спакойна гаворац: яны проста выконвалі сваю работу.

«Аналізуючы сістэму кіравання рызыкамі, пасля таго як кіроўца падаў дакументы для далейшага афармлення, было выяўлена некалькі індыкатараў, праведзена ацэнка і аналіз, пасля чаго транспартны сродак быў накіраваны на інспекцыйна-наглядны комплекс, дзе і была выяўлена ўзрыўчатка, — успомніла тыя падзеі Дар'я Савіч. — Не скажу, што мы чакалі дзяржаўных узнагарод. Але было вельмі прыемна, што нашу працу так высока ацанілі. Цяпер будзем працаваць яшчэ больш уважліва».

«Я нават не паверыў, што там сапраўды была вялікая партыя ўзрыўчаткі. Калі думаю аб тым, што магло б быць, калі б мы гэтага не заўважылі, становіцца жудасна», — падзяліўся Дзмітрый Валчковіч. На мытні ён працуе першы год. Па словах Дзмітрыя, пачынаць кар'еру з дзяржаўнай узнагародай — гэта вялікі гонар і вялікая адказнасць. І, вядома, адзначае Дзмітрый Валчковіч, цяпер апускаць планку прафесіяналізму ні ў якім разе нельга.

**Міхаіл ГУМНЯНКОЎ, дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Шайцерава»,** што ў Верхнядзвінскім раёне, усё жыццё прысвяціў сельскай гаспадарцы. «Мы, работнікі аграрна-прамысловага комплексу, цудоўна разумеем, што павінны гарантаваць харчовую бяспеку краіны. І гэта намі рухае. А сакрэт поспеху просты — гэта, перш за ўсё, каманда, працавітасць і працоўная дысцыпліна», — падзяліўся ён. З гэтага дня Міхаіл Гумнянкоў носіць ганаровае званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь». Але, паводле яго слоў, гэта заслуга ўсяго калектыву. Дырэктар гаспадаркі асабліва адзначыў дзяржаўную падтрымку, якая аказваецца сельгаспрадпрыемствам. «У тых момантах, дзе нашай гаспадарцы патрэбна дапамога дзяржавы, мы заўсёды яе атрымліваем і ўсе пытанні вырашаюцца», — расказаў Міхаіл Гумнянкоў.

У гэтым сезоне надвор'е падкінула аграрыям нямала праблем. Але спецыялiст перакана表, што прычын для панікі няма. «Мы працуем у штатным рэжыме. Азімыя перазімавалі нармальна», — запэўніў ён.

**Намеснік камандзіра авіяцыйнага атрада — начальнік аддзела трэніровак ААТ «Авіякампанія «Белавія» Уладзімір КАШАВЕЦ** цяпер «Заслужаны пілот Рэспублікі Беларусь». За яго плячыма — 20 тысяч гадзін налёту, у прафесіі ён з 1986 года. І, па яго словах, рамантыка не знікла, неба ўсё гэтак жа хвалюе, а палёты прыносяць задавальненне. Напярэдадні 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне заслужаны пілот пажадаў толькі аднаго — мірнага неба.

**Валерыя СЦЯЦКО. Фота БелТА.**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# УЗАЕМНАЯ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ

## Беларусь і Азербайджан звязвае стратэгічнае партнёрства, праверанае часам

Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр ТУРЧЫН знаходзіцца з афіцыйным візітам у Азербайджане. Учора адбыліся яго перагаворы з азербайджанскім калегам Алі АСАДАВЫМ у фармаце «адзін на адзін» і ў пашыраным складзе. Таксама кіраўнік беларускага ўрада наведаў шэраг аб'ектаў у Баку, якія ўяўляюць цікавасць для беларускага боку. Падрабязнасці — у нашым матэрыяле.

### ЁСЦЬ КУДЫ ІМКНУЦЦА

Перад пачаткам пасяджэння ў пашыраным складзе кіраўнікі ўрадаў Беларусі і Азербайджана пагутарылі ў фармаце «адзін на адзін». Аляксандр Турчын падзякаваў Алі Асадаву за шчырую размову і цёплы, сардэчны прыём.

— Беларусь і Азербайджан звязвае стратэгічнае партнёрства, не пабаюся гэтага слова. Наша партнёрства праверана часам, і ўзаемаадносіны двух нашых лідараў — яркае таму пацвярджэнне. Краевугольны камень наших адносін — гэта гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, якое ахоплівае самыя шырокія сферы і адрозніваецца высокай інтэнсіўнасцю, — сказаў Прэм'ер-міністр Беларусі.

За мінулы год узаемны тавараабарот дзвюх краін паказвае значны рост, адзначыў прэм'ер.

**— Тым не менш, на мой погляд, нам ёсць яшчэ куды імкнуцца, таму ў нашу дэлегацыю ўваходзіць шэраг кампаній, якія маглі б прапанаваць іншыя формы супрацоўніцтва, — звярнуў увагу кіраўнік беларускага ўрада.**

Што датычыцца аднаўлення тэрыторый, Аляксандр Турчын падкрэсліў, што Беларусь гатова прапанаваць комплекснае рашэнне: жыллёвае будаўніцтва, развіццё вытворчай сферы, таму што людзям перш за ўсё патрэбны работа і зарплата.

— Гэта тыя рэчы, якія мы сёння гатовыя больш шчыльна абмеркаваць з азербайджанскім бокам, — акцэнтаваў ён.

Важна і развіццё прамысловай кааперацыі, звярнуў увагу Прэм'ер-міністр, у тым ліку ў кірунку пажарнай, спецыяльнай, камунальнай тэхнікі. На думку беларускага прэм'ера, можна разгледзець далейшае пашырэнне наменклатуры гэтай тэхнікі.

Праграма знаходжання ўрадавай дэлегацыі насычаная, і кіраўнік беларускага ўрада выказаў упэўненасць, што адносіны Беларусі і Азербайджана будуць толькі развівацца.

**— Думаю, што нашы сустрэчы павінны стаць рэгулярнымі, таму мы з задавальненнем чакаем вас у нашай краіне. У нас ёсць новыя кірункі для руху наперад, — запэўніў Аляксандр Турчын.**

### РАЗВІЦЦЁ ПА ЎСІХ КІРУНКАХ

У сваю чаргу Алі Асадаў звярнуў увагу, што Азербайджан накіраваны на далейшае паглыбленне ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з Беларуссю.

— Сёння ў нас адбыўся грунтоўны і канструктыўны дыялог тэт-а-тэт па найважнейшых пытаннях, якія будуць спрыяць нашаму далейшаму ўзаемадзеянню. Мы дамовіліся па ўрадавай лініі нарасціць сумесныя намаганні па рэалізацыі падпісаных пагадненняў і даручэнняў кіраўнікоў дзяржаў, — сказаў Алі Асадаў.

Ён дадаў, што ў Беларусі і Азербайджана напрацаваны салідны багаж практычнага супрацоўніцтва, які падмацаваны вельмі шырокай дагаворна-прававой базай, — паміж краінамі падпісана больш за 170 дакументаў.

**Дзякуючы сумесным намаганням прэзідэнтаў Ільхама Аліева і Аляксандра Лукашэнкі беларуска-азербайджанскае партнёрства развіваецца па ўсіх кірунках і носіць усёабдымны характар, адзначыў Алі Асадаў.**

— Эфектыўнаму ўзаемадзеянню шмат у чым спрыяюць узаемныя візіты і сустрэчы на вышэйшым узроўні, — дадаў ён. — Пацвярджэннем гэтаму з'яўляецца 2024 год. Летась Аляксандр Лукашэнка двойчы наведваў Азербайджан. Падчас афіцыйнага візіту ў маі 2024-га быў падпісаны важкі пакет дакументаў, над рэалізацыяй якіх мы працуем.

Ён падкрэсліў, што супрацоўніцтва дзвюх краін развіваецца добрымі тэмпамі і ў многіх кірунках. Ключавым кірункам супрацоўніцтва Беларусі і Азербайджана Прэм'ер-міністр назваў прамысловую кааперацыю.

— Асаблівай увагі заслугоўвае ўзаемадзеянне паміж Гянджынскім аўтамабільным заводам і вядучымі машынабудаўнічымі прадпрыемствамі Беларусі. Праект стварэння завода па зборцы ліфтаў паспяхова рэалізаваны. Мы стабільна развіваем партнёрства ў сферы сельскай гаспадаркі. Прадукцыя беларускіх вытворцаў карыстаецца добрым попытам на азербайджанскім рынку, — расказаў ён.



Ёсць значны патэнцыял для павелічэння ўзаемных паставак сельскагаспадарчай прадукцыі, лічыць кіраўнік урада Азербайджана.

— Мы гатовыя працаваць у гэтым кірунку, — запэўніў ён.

**По матэрыялах БелТА.**
**Фота БелТА.**

**Кампетэнтна**

### «МЫ ГАРАНТУЕМ ЯКАСЦЬ ЛІФТАЎ, ЯКІЯ ВЫРАБЛЯЕМ. ДЛЯ НАС ГЭТА ВЯЛІКІ ПОСПЕХ»

Дырэктар «Магілёўліфтмаш» Руслан Страхар расказаў, што Беларусь і Азербайджан развіваюць сумесныя ініцыятывы ў розных галінах, адной з якіх з'яўляецца вытворчасць ліфтаў.

У прыватнасці, у Баку Аляксандр Турчын наведаў сумесную зборачную пляцоўку прадпрыемства «Vertus Engineering».

Вытворчасць была адкрыта ў 2022 годзе, а летась падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве з ААТ «Магілёўліфтмаш».

На плошчах азербайджанскага прадпрыемства арганізавана вытворчасць асобных дэталяў і вузлоў, у далейшым партнёры пачалі закупляць камплектуючыя для зборкі ліфтаў на базе беларускіх камплектаў.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ПА СПРАВЯДЛІВАСЦІ

## Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла прыём грамадзян у Жабінцы

Мерапрыемства адбылося ў рамках адзінага дня прыёму грамадзян членамі Савета Рэспублікі ў Брэсцкай вобласці. Людзі ішлі туды з самымі рознымі пытаннямі: ад асабістых да грамадска значных. Некаторыя прыехалі з іншых гарадоў, нават іншых абласцей. Кожны імкнуўся данесці сваю праблему, атрымаць адказ альбо параду, спадзяванне на вырашэнне пытання.



Георгій Іванавіч жыве ў аграгарадку Брэсцкага раёна. Некалькі гадоў мужчына працаваў у Расіі, у тым ліку на Крайняй Поўначы, але не ўвесь гэты стаж быў улічаны прыналічэнні пенсіі. Пра работу ў суседняй краіне ёсць запісы ў працоўнай кніжцы, але няма пацвярджальных дакументаў. Наталля Качанава тут жа звязалася з міністрам працы і сацыяльнай абароны Наталляй Паўлючэнка. Міністр паабяцала накіраваць афіцыйны запыт у Расію і, у выпадку станоўчага адказу, выправіць сітуацыю. «Гэта вельмі важна, каб уся праца была ўлічана. У нас жа з Расіяй брацкія адносіны, няма ніякіх перашкод, каб аднавіць справядлівасць і скарэкціраваць памер пенсіі», — заўважыла Старшыня Савета Рэспублікі.

Таццяна Уладзіміраўна прыехала з Баранавіч. Заяўніца патлумачыла, што з мужам у свой час яны заключылі шлюбны дагавор, які прадугледжваў у выпадку скасавання шлюбу выплату мужам акрамя аліментаў штомесячнай матэрыяльнай дапамогі. Але пасля разводу ён не стаў выконваць пункт дагавора па выплаце дапамогі. Выходзіць, што шлюбны дагавор складаецца ў разліку на добрасумленнасць кожнага з бакоў. А прымусіць некага выконваць узятыя абавязацельствы немагчыма. Гэта ўжо справа сумлення. І гэта адзін бок медаля. Другі ж заключаецца ў тым, што і ад аліментаў можна ўхіліцца. У прыватнасці, былы муж заяўніцы плаціць мінімальныя аліменты як беспрацоўны. Але ён мае рабочую візу і, паводле яе звестак, перыядычна працуе ў Польшчы. Жыхарка Баранавіч прапануе замацаваць заканадаўча норму, якая прадугледжвае спаганяць аліменты ў разліку ад сярэдняй зарплаты нашай краіны альбо нават ад сярэдняй зарплаты той краіны, дзе знаходзіцца адказчык некалькі месяцаў у год.

**Старшыня Савета Рэспублікі заўважыла, што падобныя праблемы ўздымаюць жанчыны амаль на кожным прыёме. Заканадаўца ведае праблему, работа ў гэтым кірунку вядзецца. «Вельмі важна вырашаць**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# ВЫСОКАЯ СТУПЕНЬ АДКАЗНАСЦІ

## У Палаце прадстаўнікоў пад кіраўніцтвам Ігара СЕРГЯЕНКІ

### «ЖУРНАЛІСТЫКА ВЫКОНВАЕ АДНУ З КЛЮЧАВЫХ ФУНКЦЫЙ ПА АБАРОНЕ ІНФАРМАЦЫЙНАГА СУВЕРЭНІТЭТУ НАШАЙ КРАІНЫ»

У Авальнай зале адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў конкурсу на найлепшую творчую работу па асвятленні дзейнасці Палаты прадстаўнікоў. На конкурс «Палата прадстаўнікоў у фокусе СМІ», які праводзіўся ўпершыню, было прадстаўлена 186 работ з 81 сродку масавай інфармацыі. Плануецца, што конкурс будзе праводзіцца на пастаяннай аснове.



*Дыпломам I ступені конкурсу на найлепшую творчую работу «Палата прадстаўнікоў у фокусе СМІ» ў намінацыі «Найлепшы аўтарскі матэрыял у рэспубліканскіх друкаваных СМІ і сеткавых выданнях» узнагароджана рэдактар аддзела палітыкі рэдакцыі газеты «Звязда» Вераніка Канюта. За прафесійнае майстэрства, аб'ектыўнае і ўсебаковае асвятленне дзейнасці Палаты прадстаўнікоў журналісту аб'яўлена Падзяка Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.*

Як звярнуў увагу **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА,** большасць работ на конкурс была заяўлена рэгіянальнымі масмедыя. «Гэта асабліва актуальна ў кантэксце тых задач, якія паставіў перад журналістамі кіраўнік дзяржавы на форуме медыйнай супольнасці Беларусі ў Магілёве ў маі мінулага года», — адзначыў ён.

Ігар Сергяенка заўважыў, што цырымонія ўшанавання пераможцаў конкурсу на найлепшую творчую работу па асвятленні дзейнасці Палаты прадстаўнікоў адбываецца напярэдадні святкавання 80-годдзя Вялікай Перамогі. «У гады Вялікай Айчыннай вайны друкаванае слова было магутнай зброяй у барацьбе з ворагам, крыніцай сілы і натхнення людзей на подзвіг, несла праўду аб тым, што адбывалася на франтах, — падкрэсліў ён. — У цяперашні час Беларусь зноў апынулася ў эпіцэнтры барацьбы за перадзел свету. І ва ўмовах вострага ідэалагічнага супрацьстаяння менавіта журналістыка выконвае адну з ключавых функцый па абароне інфармацыйнага суверэнітэту нашай краіны і прасоўванні мірнага, стваральнага парадку дня».

**Звяртаючыся да медыйнай супольнасці, спікер канстатаваў, што парламентарыі, якія працуюць з журналістамі ў адной звязцы, высока шануюць іх працу, уклад, які яны ўносяць у падтрыманне дыялогу паміж дзяржавай і грамадствам, забеспячэнне народнага адзінства. Старшыня Палаты прадстаўнікоў выказаў удзячнасць кіраўнікам СМІ, усім, хто працуе ў сферы сродкаў масавай інфармацыі, за сумленнасць, вернасць прафесіі, сапраўдную грамадзянскую пазіцыю, патрыятызм, увагу да парламенцкай дзейнасці і эфектыўнае супрацоўніцтва. «Наша канструктыўнае ўзаемадзеянне прыняло сістэмны характар і стала плённым», — рэзюмаваў Ігар Сергяенка.**

### ПОДЗВІГ, ПРА ЯКІ МНОГІЯ НЕ ХОЧУЦЬ ПАМЯТАЦЬ

Трэція парламенцкія чытанні на тэму «Вызваленне краін Усходняй Еўропы ад нацызму» адбыліся ў Авальнай зале. На папярэдніх чытаннях, якія праходзілі ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, парламентарыі абмеркавалі вытокі мужнасці і гераізму савецкага чалавека, раскрылі найважнейшыя старонкі партызанскага руху і падпольнай барацьбы на тэрыторыі Беларусі. Чарговыя чытанні прысвечаны творчасці пісьменнікаў-франтавікоў, якая знаходзіла гарачы водгук у сэрцах савецкіх воінаў і працаўнікоў тылу, натхняла на гераічныя ўчынкі, усяляла ўпэўненасць у хуткую Перамогу.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка нагадаў, што нядаўна беларуская парламенцкая дэлегацыя вярнулася з Валгаграда, дзе прайшло маштабнае міжнароднае мерапрыемства — форум «Вялікая спадчына — агульная будучыня», у якім узялі ўдзел каля 20 дэлегацый з сяброўскіх краін.

«Многія бачылі ў сродках масавай інфармацыі, наколькі ўрачыста і пранікнёна прайшло гэта мерапрыемства, якія былі ацэнкі, наколькі яркім было выступленне нашага Прэзідэнта на міжнародным форуме, — канстатаваў спікер. — І галоўная выснова, для чаго нам неабходна захоўваць гістарычную памяць аб вайне, — па-першае, нам ёсць чым ганарыцца, як сказаў Прэзідэнт. І, па-другое, перад пагрозай магчымай гарачай вайны ёсць неабходнасць

**па справядлівасці — апошняе заўсёды падкрэслівае наш кіраўнік дзяржавы. А па справядлівасці будзе ўтрымліваць дзіця годна, у адпаведнасці з даходамі, якія атрымліваеш», — пракаментавала Наталля Качанава.**

Заяўнікі з Чэрняў прыйшлі скардзіцца на частыя праверкі дзейнасці іх асабістай падсобнай гаспадаркі. Гэта гісторыя мае нават крымінальны складнік і не толькі. У 2023 годзе ў іх на сядзібе здарыўся пажар, прычынай узгарання стала кінутая суседам петарда. У агні загінулі 34 свінні і 17 парасят. Праваахоўныя органы вынеслі сваю ацэнку, вінаватыя былі пакараны. Гаспадары тым



часам аднавілі гаспадарчыя пабудовы і пагалоўе свіней. Цяпер сусед піша скаргі на смурод, на парушэнне санітарных і ветэрынарных норм, да гаспадароў кожны тыдзень ездзяць камісіі. Муж і жонка скардзяцца, што праверкі ім перашкаджаюць працаваць.

Але ж варта ўлічваць, што свінарнік знаходзіцца побач з жылымі дамамі. Апошнія змяненні заканадаўства дазваляюць так размяшчаць пабудовы. І суседзі вымушаны жыць ва ўмовах гэтага паху. Дзмітрый Гарадзецкі, першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама, выязджаў на месца. Ён перакананы, што ранейшыя нормы, якія рэгулявалі адлегласць жывёлагадоўчых памяшканняў ад жылля, а таксама нормы плошчы ўчастка на адну галаву жывёлы трэба вярнуць. Чэрні — гэта прыгарад Брэста, фактычна прыватны сектар, і трымаць на ўчастку ў 15 сотак дзясяткі галоў жывёлы азначае ствараць не проста нязручнасці, а ўмовы, складаныя для пражывання суседзяў.

Наталля Качанава падкрэсліла, што людзей-працаўнікоў трэба ўсяляк падтрымліваць, але прапанавала сужэнцам прадумаць магчымасць пераносу гаспадарчых пабудоў, а калі пагодзяцца на пераезд, то ў іншым рэгіёне краіны ім прапануюць вельмі выгаднае месца.

**Быў гэтым разам на прыёме і зусім юны наведвальнік. Баранавіцкі школьнік распрацаваў адукацыйную платформу, якой ужо карыстаюцца студэнты. Максім Парыпа працуе яшчэ над адным праектам, што датычыцца сельскай гаспадаркі. Школьнік прапаноўвае праграму па аптымальным выкарыстанні ўгнаенняў: скануецца поле, выбіраюцца віды ўгнаенняў, ідзе поўны разлік. Хлопец хоча, каб праграмы знайшлі практычнае прымяненне ў краіне, з гэтым і прыйшоў. Прадстаўнікі Міністэрства адукацыі атрымалі даручэнне азнаёміцца з напрацоўкамі дзевяцікласніка і прыняць адпаведнае рашэнне.**

А вось бацькі салдата тэрміновай службы з Гомеля надзвычай заклапочаны станам здароўя сына. Сын быў прызваны на службу год таму. У перыяд службы яму правялі аперацыю на калене. Пасля лячэння і рэабілітацыі хлопца адправілі на даабследаванне ў шпіталь. Паводле апошняга заключэння, ён прызнаны годным да службы з абмежаваннямі. Бацькі непакояцца, што за апошнія восем месяцаў службы сын амаль кожны месяц бывае ў шпіталі, яму баліць нага, ён кульгае. Яны лічаць, што яму не забяспечылі належны ўзровень лячэння першы раз альбо былі допушчаны ўрачэбныя памылкі. Наталля Іванаўна ўзяла пад асабісты кантроль праблему сям'і і паабяцала, што будзе праведзена ўсебаковая праверка.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# І ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ

## прайшоў шэраг мерапрыемстваў

даносіць гэту праўду, каб не паўтараць памылкі мінулага».

Кажучы аб бягучых парламенцкіх чытаннях, на якіх прагучаў даклад аб вызваленні краін Усходняй Еўропы ад фашызму, Старшыня Палаты прадстаўнікоў звярнуў увагу на тое, што 80 гадоў таму, у гэтыя дні, паў Берлін. «Войскі Чырвонай Арміі ішлі ў Прагу, каб вызваліць чэхаславацкі народ ад фашызму, паколькі 5 мая пачалося паўстанне ў Празе, і ў ноч на 6 мая войскі танкавай калоніі рушылі туды, — узнавіў старонкі гісторыі Ігар Сергяенка. — Я хацеў бы нагадаць, што некаторыя краіны Усходняй Еўропы ўступілі ў вайну супраць Савецкага Саюза разам з Германіяй: Румынія, Венгрыя, Славакія, Харватыя і Балгарыя, якая, праўда, войскі свае не накіроўвала. А 600-тысячная румынская армія ўступіла на тэрыторыю Савецкага Саюза. Яны адрозніваліся асаблівымі зверствамі на тэрыторыі Адэсы, падчас той жа Сталінградскай бітвы».

**Па словах спікера, нягледзячы на тое, што прадстаўнікі шэрагу заходніх краін ваявалі супраць савецкага народа, былі сярод іх тыя людзі, якія змагаліся з фашыстамі. «Сёння многія палітыкі, у першую чаргу ва Усходняй Еўропе, у шэрагу краін, забыліся аб тым подзвігу, — адзначыў ён, нагадаўшы пра знос помнікаў воінам Чырвонай Арміі. — Але тысячы, сотні тысяч савецкіх салдат гінулі на тэрыторыі Усходняй Еўропы і пасля 8, 9 мая... Так, было пераможнае наступленне ўжо ў 1945-м, але страты былі страшныя».**



Больш падрабязна аб вызваленні Усходняй Еўропы ад нацызму, важкім укладзе савецкіх салдат у гэты вызваленчы паход Чырвонай Арміі расказаў старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Мікалай Бузін. Для дэпутатаў, членаў Маладзёжнага савета пры Палаце прадстаўнікоў, запрошаных быў прадэманстраваны дакументальны фільм аб вызваленні Усходняй Еўропы ад нацызму. У другой частцы парламенцкіх чытанняў прагучалі вершы пра Вялікую Айчынную вайну, аўтарамі якіх з'яўляюцца сучасныя паэты — члены Саюза пісьменнікаў Беларусі.

### МАГЧЫМАСЦЬ ДАЛУЧЫЦЦА ДА ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ

Пры Палаце прадстаўнікоў сфарміраваны Маладзёжны савет. Ажыццяўляць свае паўнамоцтвы ў новым статусе маладыя парламентарыі, якія прадстаўляюць усе рэгіёны краіны, пачалі з ушанавання памяці герояў і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны — члены Маладзёжнага савета пры Палаце прадстаўнікоў усклалі кветкі да стэлы «Мінск — горад-герой». Ужо ў Авальнай зале, дзе адбылося першае пасяджэнне Маладзёжнага савета, быў зацверджаны рэгламент савета, выбраны падліковая камісія і сакратарыят. Таксама члены Маладзёжнага савета выбралі старшыню, яго намеснікаў, старшынь камісій. Зацверджаны склад прэзідыума нававыбранай парламенцкай структуры.

Звяртаючыся да маладых парламентарыяў, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка адзначыў, што гэта знакавая падзея ў жыцці кожнага з іх. «Гэта высокая ступень адказнасці, — кажучы аб новым статусе маладых людзей, падкрэсліў спікер. — Па сутнасці, правоў у вас стала юрыдычна не так ужо і больш, але адказнасці, грамадзянскай адказнасці перад сваімі сваякамі, перад жыхарамі вашых рэгіёнаў, землякамі, напэўна, стала больш. У вас з'явілася магчымасць далучыцца да грамадска-палітычнага жыцця нашай краіны, апынуўшыся ў складзе Маладзёжнага савета».

Спікер праінфармаваў аб дзейнасці Палаты прадстаўнікоў, паўнамоцтвах дэпутацкага корпуса. «Значная частка работы праходзіць не ў гэтым памяшканні: работа вядзецца ў камісіях, падчас разгляду тых ці іншых законапраектаў, — удакладніў ён. — Пры гэтым узнікаюць спрэчкі, дыскусіі — не ўсе законапраекты прымаюцца з ходу. Паступае шэраг прапаноў, і, самае галоўнае, нам заўсёды патрэбна ацэнка інфармацыі, якая, як прынята казаць, паступае ў СМІ. Таму мы разлічваем у гэтым плане ў тым ліку і на вашу пасільную дапамогу. Уносці голас моладзі па тых ці іншых пытаннях у вас з'явілася магчымасць».

Па словах Ігара Сергяенкі, галоўнай задачай членаў Маладзёжнага савета павінна стаць садзейнічанне. Найперш — дэпутату сваёй акругі (выбрана 110 маладых парламентарыяў, колькі і дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў). Спікер выказаў упэўненасць, што дэпутаты ў сваёй дзейнасці будуць выкарыстоўваць рэсурс гэтых маладых людзей.

«Мы разлічваем на вашу актыўную дапамогу, паколькі ўсе вы — актыўныя маладыя людзі, найлепшыя прадстаўнікі моладзі нашай краіны, — канстатаваў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Вам аказаны высокі гонар і давер працаваць тут на грамадскіх пачатках. Упэўнены, што ўдзел у рабоце Маладзёжнага савета дасць вам пэўны досвед далучэння да грамадска-палітычнага жыцця нашай краіны. Па сутнасці, вы — наш рэзерв. Многія з вас вырастуць да дэпутатаў мясцовых саветаў, дэпутатаў парламента, зоймуць іншыя пасады. Хацелася б, каб падчас работы ў Маладзёжным савеце вы набылі пэўны досвед, які паслужыў бы вам на карысць у плане далейшага развіцця. Магчымасці для гэтага створаны».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении **28 мая 2025 года** повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| Капитальное строение с инв. № в ЕГРНИ 600/С-122808, общей площадью 24,4 кв. м (наименование: помещение насосной станции мазута; составные части и принадлежности: кирпичное здание помещения насосной станции мазута 3А1/к, с резервуарами под мазут а1) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 0,0774 га, кадастровый номер – 623650100001005578 |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17/3 |
| Начальная цена: 100 000,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 10 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **28 мая 2025 года в 11.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 07.05.2025 по 27.05.2025 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону: (017) 388-43-21.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

ИЗВЕЩЕНИЕ
ОБ ОТМЕНЕ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА

***ОАО «Н Холдинг»***
***не будет проводить открытый аукцион по продаже имущества***

| | |
|---|---|
| ЛОТ № 1 | Капитальное строение с инв. № 500/С-50398, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 8/1. Площадь – 1907,0 кв. м. Наименование – Здание специализированное иного назначения. Назначение – Здание неустановленного назначения. Составные части и принадлежности: Основное строение, тамбур, холодная пристройка. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 500/С-50734, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 8/2. Площадь – 643,6 кв. м. Наименование – П2/к Здание специализированное иного назначения. Назначение – Здание неустановленного назначения. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 500/С-24324, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 8/3. Площадь – 918,0 кв. м. Наименование – Административное здание. Литер З 2/к. Назначение – Здание административно-хозяйственное. Обременение: аренда.<br>Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 500000000005005775, площадью 3,2282 га, предоставленном продавцу на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен).<br>На земельном участке установлены следующие ограничения: охранная зона линий электропередачи, площадь 0,4265 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,4265 га; охранная зона сетей и сооружений канализации, площадь 0,4265 га; охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0490 га; охранная зона сетей и сооружений газоснабжения, площадь 0,4265 га |
| **Данные по аукциону** | Аукцион был назначен на **22 мая 2025 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона



У СФЕРЫ АСАБЛІВАЙ УВАГІ

# ДРАЙВЕРЫ РОСТУ

**Беларуская эканоміка расце апераджальнымі тэмпамі. За кошт чаго?**



Па выніках першага квартала 2025-га адзначаецца рост эканомікі: ВУП павялічыўся на 3,1 % пры прагнозе 2,7 %. Хто ўнёс уклад у гэтую скарбонку, у інтэрв'ю «Першаму інфармацыйнаму» распавёў першы намеснік міністра эканомікі Андрэй КАРТУН.

## ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ЛІДАРЫ

— Старт, сапраўды, ндрэнны: апярэджанне прагнозага графіка на 0,4 %, — падкрэсліў у пачатку гутаркі Андрэй Картун.

Ён адзначыў, што ўклад у гэты рост унеслі чатыры галіны: будаўніцтва, прамысловасць, інфармацыя і сувязь і гандаль.

— Будаўніцтва — галоўны драйвер, які паўплываў на тое, каб ВУП быў вышэйшы за прагнозныя значэнні. Тэмп росту па будаўніцтве 115,6 % — гэта істотна, — акцэнтаваў увагу прадстаўнік Мінэканомікі.

І тут значны ўклад унеслі такія складнікі, як будаўніцтва жылля і дарог.

Андрэй Картун адзначыў, што апераджальнымі тэмпамі ідзе будаўніцтва жылля — тэмп росту склаў 118 %. Больш за 900 тысяч квадратных метраў жылля ўведзена ў эксплуатацыю ў першым квартале 2025-га.

Яшчэ адзін складнік, які паўплываў на пазітыўныя паказчыкі, — будаўніцтва дарог. Па выніках першага квартала тут назіраецца тэмп росту больш за 122 %.

Што датычыцца гандлю, то, паводле даных Белстата, яго тэмп росту за першы квартал 2025 года склаў 103,3 %.

## IT-СЕКТАР АЖЫВАЕ

У ліку драйвераў — сфера інфармацыі і сувязі. Так, за тры месяцы з пачатку года тэмп росту гэтай галіны дасягнуў паказчыка 106,1 %.

Першы намеснік міністра расказаў, што пачынаючы з другой паловы мінулага года IT-сфера выйшла на ўстойлівы рост. Добрым сігналам, на яго думку, можна лічыць рост колькасці занятых:

— За мінулы год прырост IT-спецыялістаў у галіне — болей за паўтары тысячы. Думаю, што з улікам тых мер,

# ЭПОХА ДВУХ ІНТЭЛЕКТАЎ

## КОЛЬКІ ГАДОЎ ШІ?

Агульнапрынятага азначэння таго, што такое штучны інтэлект, у свеце пакуль не сфармулявана.

— Азначэнні мяняліся па меры таго, як змянялася разуменне ШІ, — кажа Аляксандр Тузікаў. — А першапачаткова гэта не зусім карэктны пераклад з англійскай мовы: у словазлучэнні «artificial intelligence» маецца на ўвазе не ўсёабдымнае паняцце «інтэлект», а гаворка ідзе толькі аб некаторых інтэлектуальных функцыях. Але назва са словам «інтэлект» укаранілася і ў рускай, і ў многіх іншых мовах, і сёння яна ўжо цалкам правамерная.



Першыя мадэлі нейрасетак у 1960-х дазволілі апраксіміраваць (спрошчана мадэляваць) работу мозга, расказвае суразмоўнік. Атрымліваючы на ўваходзе нейкую інфармацыю ад некалькіх крыніц, мадэль або пераходзіла ў актыўны стан, або не рэагавала (вобразна кажучы, ёй было нецікава).

— У 1980-х з'явілася паняцце асацыятыўнай памяці — такую мадэль назвалі «сеткай Хопфілда» ў гонар аўтара, прафесара Джона Хопфілда, які атрымаў у 2024 годзе Нобелеўскую прэмію па фізіцы. А ў 2000-я былі ўведзены так званыя «глыбокія мадэлі», — тлумачыць Аляксандр Тузікаў. — Тады іх было складана выкарыстоўваць: для гэтага патрабавалася вырашаць задачы з вялікай колькасцю параметраў. Але ў 2010-х усё сышлося: з'явіліся вылічальнікі, адаптаваныя алгарытмы, і людзі сталі рыхтаваць даныя, на якіх мадэль можна навучаць, вылічаць значэнні яе параметраў. І менавіта на гэты час прыпадае грандыёзны прарыў у галіне прымянення глыбокіх нейронных сетак, якія маюць шмат слаёў перадачы інфармацыі і велізарную колькасць параметраў.

За апошнія дзесяцігоддзе, кажа суразмоўца, нейрасеткі навучыліся таму, што ў 1990-х падавалася нерэальным. Напрыклад, распазнанню мовы.

— Розныя людзі гавораць па-рознаму, выразна ці не выразна, змяняюць парадак слоў, выкарыстоўваюць слэнг. Сёння праграма ў стане перавесці гэтыя даныя ў літаратурны тэкст, зрабіць пераклад на любую мову свету і агучыць (калі хочаце, вашым голасам) на іншай мове, — заўважае загадчык лабараторыі. — Такія праграмы ўжо даступныя для работы на смартфоне. Такім чынам, пытанне разумення людзей, якія размаўляць на розных мовах, практычна вырашана.

З'явіліся мадэлі, якія сталі з поспехам вырашаць задачы, што раней лічыліся прэрагатывай чалавека. У 1990-я камп'ютар абыграў чэмпіёна свету па шахматах. Пазней — выйграў у чэмпіёна свету ў больш складанай інтэлектуальнай гульні, кітайскім Го. А ў 2020-м здарыўся прарыў, які назвалі адным з найважнейшых дасягненняў у навуцы: з дапамогай камп'ютара ўдалося вырашыць задачу з вылічальнай біялогіі — прадказанне структуры бялка па яго лінейнай паслядоўнасці.

— Усе працэсы ў арганізме чалавека абумоўлены ўзаемадзеяннем бялкоў, — тлумачыць Аляксандр Тузікаў. — А бялкі — гэта біялагічныя структуры з трохмернай формай. З іншага боку, бялок — паслядоўнасць амінакіслот, якая і вызначае яго трохмерную структуру. Структура гэта вельмі важная, каб прадказаць, як бялкі будуць узаемадзейнічаць, якія іх сайты ўплываюць на тыя ці іншыя біялагічныя функцыі. Раней задача вырашалася эксперыментальна, з дапамогай метадаў рэнтгенаўскай крышталаграфіі. Гэта быў доўгі, дарагі і не заўсёды магчымы працэс.

У дадзенай сферы нават існавалі сусветныя спаборніцтвы, расказвае суразмоўца. Вылічальныя біёлагі прадказвалі трохмерную структуру бялка, ведаючы паслядоўнасць амінакіслот, а потым іх вынікі параўноўваліся з атрыманай эксперыментальна мадэллю. У 2020 годзе з вялікім адрывам гэта спаборніцтва выйграла нейрасетка. Праграма AlphaFold, распрацаваная кампаніяй Google DeepMind, абышла вядучых сусветных спецыялістаў у прадказанні структуры бялка. І гэта дазволіць атрымаць прарыўныя вынікі ў распрацоўцы лекаў, вакцын і ў цэлым у медыцыне. Чалавецтва зможа ацаніць іх ужо ў найбліжэйшай будучыні.

## ПАМОЧНІК АБО САПЕРНІК?

Здавалася б, усё гэта нас пакуль не закранае. Ну, кіпяць у навуковым асяроддзі нейкія страсці, пра якія большасць людзей і не падазрае. Але на факце закранае: свет імкліва змяняецца, і ўжо гадоў праз 20, цалкам магчыма, ён будзе зусім іншым...

Пакаленне, народжанае яшчэ ў СССР, не можа не памятаць фільм пра Электроніка: «Укалываюць роботы — шчаслівы чалавек!» Меркавалася: чым далей будуць развівацца тэхналогіі, тым у большай ступені цяжкая фізічная праца для чалавека будзе адыходзіць у мінулае. Часткова гэта так, але вось ШІ якраз забірае сабе сферы інтэлектуальныя: піша праграмы, карціны і артыкулы, робіць бізнес-прагнозы і дыягнастуе хваробы, нярэдка дакладней і хутчэй за чалавека. У творчых прафесіях цэніцца крэатыў, але сучасныя мадэлі ШІ ўжо сёння ў стане прадбачыць і зымітаваць самыя нестандартныя крокі творцы-чалавека.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*




якія прымаюцца для павелічэння ўнутранага попыту на IT-прадукты, у гэтай сферы ёсць усе шанцы стаць, як і некалькі гадоў таму, адным з ключавых драйвераў эканомікі.

Гаворачы аб пераарыентацыі экспартных патокаў у IT-сферы, Андрэй Картун растлумачыў, што калі да 2022 года асноўнымі спажыўцамі былі краіны ЕС і ЗША, то цяпер — карціна іншая:

— Значны рост удзельнай вагі па экспарце адзначаецца ў краіны СНД.

Што датычыцца спажывання IT-прадукту ў Беларусі, ён адзначыў, што ўнутраны попыт сфарміраваўся і хутка расце:

— Перад сабой, у тым ліку ў праграмных дакументах, мы ставім амбіцыйныя мэты: рост лічбавай эканомікі, дабаўленай вартасці.

## АКЦЭНТ — НА РЭГІЯНАЛЬНУЮ ІНІЦЫЯТЫВУ

Закранаючы інвестыцыі ў асноўны капітал, першы намеснік міністра эканомікі адзначыў, што за першы квартал 2025-га тут таксама адбыўся рост больш чым на 18 %.

За кошт чаго?

З памяці людзей мэтанакіравана выцесняюць ісціну, замяняючы яе віртуальнай карцінкай. Сучасная чалавека пазбаўляюць першакрыніц і інфармацыі, паслядоўна разбураюць здольнасць да філасофскага мыслення, навязваючы ўласнае спрошчанае светаразуменне. У ход ідуць усе магчымыя сродкі: заказныя даследаванні, тыражаванне лжывых наратываў, інфармацыйныя атакі, рэдагаванне сацыяльных сетак і выбіральны доступ да інфармацыі, прапагандысцкія апераацыі і адкрытая фальсіфікацыя фактаў.

Адным са значных дасягненняў мэтанакіраванага інфармацыйна-псіхалагічнага ўздзеяння стала перайменаванне ўсенароднага свята. Сёння для большасці краін Еўропы гэта не Дзень Перамогі (9 мая), а Дзень памяці і прымірэння (8 мая). Па сутнасці, спадчыннікі фашыстаў і іх памагатыя, якія ўвасабляюць аб'яднаны Захад, ажыццявілі фарматаванне грамадскай свядомасці і ўкараненне нацысцкіх ідэалаў.

Фальсіфікаваць гістарычную праўду не саромеюцца і ў Вашынгтоне. Трамп 2 мая, напярэдадні 80-годдзя Перамогі, абвясціў, што менавіта ЗША атрымалі перамогу і ў Першай, і ў Другой сусветных войнах: «Многія нашы саюзнікі і сябры святкуюць 8 мая як Дзень Перамогі, але мы зрабілі больш, чым любая іншая краіна, для дасягнення пераможнага выніку ў Другой сусветнай. Гэтым пераймяноўваем 8 мая ў Дзень Перамогі ў Другой сусветнай вайне, а 11 лістапада — у Дзень Перамогі ў Першай сусветнай вайне. Мы выйгралі абедзве вайны, ніхто не быў з намі блізкі па сіле, храбрасці або ваенным майстэрстве, але мы ніколі нічога не святкуем — гэта таму, што ў нас больш няма лідараў, якія ведаюць, як гэта рабіць! Мы збіраемся зноў пачаць святкаваць нашы перамогі!»

Вось так, без іміжвай сціпласці і з поўнай рашучасцю «зрабіць Амерыку вялікай ізноў» дзейнічае цяперашні прэзідэнт ЗША.

## НЕ РАССЛАБЛЯЦЦА І НЕ ВЕРЫЦЬ ПАКАЯННЯМ

У гэтых умовах Міжнародны форум Саюзнай дзяржавы «Вялікая спадчына — агульная будучыня», які адбыўся 28—29 красавіка 2025 года ў Валгаградзе, выступае інструментам захавання і абароны агульнай памяці. Прадстаўнікі дваццаці парламенцкіх дэлегацый, вучоныя, палітыкі, грамадскія дзеячы вялі дыялог аб Вялікай Айчыннай вайне, падкрэсліваючы недапушчальнасць перагляду яе вынікаў. Кульмінацыяй форуму сталі выступленні лідараў Беларусі і Расіі.

У рамках свайго выступлення Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Мы звяртаемся да гісторыі, каб абараніць не толькі будучыню, але ўжо сучаснасць. Мы спадчыннікі вялікага пакалення — герояў-пераможцаў. Нам супраціўстаяць нашчадкі прыхільнікаў Трэцяга рэйха».

«Для абароны гістарычнай памяці трэба рабіць яшчэ больш. Ніколі нельга расслабляцца. Ніякім пакаянням верыць нельга, толькі рэальным справам. Праўда аб Вялікай Айчыннай вайне — наш шчыт. Трымаць яго ў сваіх руках — вялікі гонар і адказнасць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

У сучаснай Беларусі памяць аб Вялікай Перамозе — гэта частка нацыянальнай ідэі, якая знайшла адлюстраванне ў палажэннях Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 12 «Аб рэалізацыі асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы», падпісанай 9 красавіка 2025 года. Гэты ўсёабдымны дакумент накіраваны на развіццё і стваральную працу, з'яўляецца своечасовым адказам на спробы разбурыць ментальную сферу нацыі, замяніць рэальнасць віртуальнымі канструкцыямі.

Загінулыя на палях бітваў не могуць сябе абараніць. Захаваць гістарычную памяць і іх дасягненні — абавязак нашага пакалення. Невыпадкова ў артыкулах 15 і 54 Канстытуцыі краіны замацавана:

«Арт. 15. Дзяржава адказная за захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцяў, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь.

Дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны;

арт. 54. Кожны абавязаны берагчы гісторыка-культурную, духоўную спадчыну і іншыя нацыянальныя каштоўнасці.

Захаванне гістарычнай памяці пра гераічнае мінулае беларускага народа, патрыятызм з'яўляюцца абавязкам кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь».

## БАРАЦЬБА ГЕАСТРАТЭГІЧНАГА МАШТАБУ

Сучасныя маніпулятары настолькі загуляліся з фактамі і іх інтэрпрэтацыяй, што пачалі забываць ісціны, якія ўпісаны ў аналы гісторыі. Польшча была заваявана Германіяй за 36 дзён, а Магілёўская бітва доўжылася 26 сутак. Данія пратрымалася роўна дзень, а ўся Еўропа скарылася за тры месяцы (Францыя пратрымалася 43 дні). У сваю чаргу Ленінград змагаўся і не скарыўся на працягу 872 дзён і начэй, а Сталінград — 200 сутак, забяспечыўшы пералом у вайне і пераход стратэгічнай ініцыятывы да Савецкага Саюза.

Сённяшнім еўрапейцам нялішнім будзе нагадаць, што планамі Гітлера прадугледжвалася поўная ліквідацыя іх дзяржаўнасці з уключэннем тэрыторый у склад вялікагерманскага рэйха. І вызваляць іх давялося нашым салдатам, паклаўшы на алтар перамогі над фашызмам мільён жыццяў. Памятаць аб гэтым — наш святы абавязак.

Гістарычная памяць і праўда аб вайне выступаюць своеасаблівымі засцерагальнікамі, якія гарантуюць мір у сучасным грамадстве. А Дзень Перамогі — найважнейшым духоўным стрыжнем, вакол якога аб'ядноўваюцца дзясяткі мільёнаў людзей. Вялікая Перамога стала сімвалам нашай агульнай гісторыі — сімвалам подзвігу і гераізму нашых бацькоў і дзядоў, асновай нацыянальных сістэм бяспекі.

«Людзі, будзьце пільныя!» — заклік чэшскага пісьменніка Юліуса Фучыка, забітага фашыстамі, сёння вельмі актуальны. Разам з тым сучасная рэальнасць дыктуе неабходнасць дапоўніць яго другой часткай: «Беражыце гістарычную праўду, вучыцеся на яе прыкладах і не паўтарайце памылак...»

**Мікалай БУЗІН,**
**старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў,**
**доктар ваенных навук, прафесар.**

МЕРКАВАННЕ

# НА ЭНЕРГАПРЫВЯЗІ

## Еўрачыноўнікі мяняюць аблічча звыклай нам заможнай Еўропы



**Страта канкурэнтаздольнасці ЕС — тэндэнцыя апошніх дзесяцігоддзяў. Гэты спад можна растлумачыць найперш памылковымі рашэннямі еўрабюракратаў, якія ідуць уразрэз як з сучаснымі арыенцірамі сусветнай эканомікі, так і з інтарэсамі простых еўрапейцаў.**

Рост эканомікі Еўрасаюза на 2025 год прагназуецца на ўзроўні 0,8 %, але гэта, хутчэй, аптымістычны прагноз, улічваючы наступствы тарыфных ініцыятыў Трампа як у цэлым для сусветнай эканомікі, так і Еўрасаюза ў прыватнасці.

На першы погляд, здаровы розум падказвае, што неабходна правесці «работу над памылкамі», якія прывялі да жаласнага стану ў цэлым еўрапейскай эканомікі, і перастаць гуляць у «санкцыйную рулетку». Паколькі ў выніку ўсе наступствы такой палітыкі рана ці позна непазбежна адаб'юцца на простых еўрапейцах, што радыкальна зменіць аблічча звыклай нам «заможнай Еўропы».

Але, відаць, у чыноўнікаў з Бруселя іншыя прыярытэты і логіка, таму яны вырашылі прытрымлівацца прымаўкі «згарэў хлеў — гары і хата».

Як паведамляе агенцтва Bloomberg, замест таго каб вырашаць надзённыя энергетычныя праблемы, Еўракамісія працуе над спецыяльным законам, які дазволіць забараніць еўрапейскім фірмам падпісваць новыя кантракты на расійскія энерганосьбіты. Прычым мяркуецца, што новы механізм дасць магчымасць уводзіць абмежаванні без адабрэння ўсіх краін Еўрасаюза. І гэта пры тым, што Венгрыя і Славакія ўжо далі зразумець, што не збіраюцца ўдзельнічаць у гэтым эканамічным самагубстве. У Еўропе цяпер цэны ў тры-пяць разоў вышэйшыя, чым у ЗША. Еўрапейскія кампаніі катастрафічна губляюць сваю канкурэнтную перавагу, аплачваючы новыя рахункі за энерганосьбіты замест інвестыцый у інавацыі.

Эфект ад новай ініцыятывы прадказальны: чарговы віток росту цэн, новыя складанасці для прамысловасці і задаволеныя твары амерыканскіх пастаўшчыкоў звадкаванага прыроднага газу. Відаць, у Бруселі канчаткова забыліся, што санкцыі не павінны наносіць шкоду ўласнай эканоміцы. А ў выніку — дэіндустрыялізацыя еўрарэгіёна, бескантрольны рост цэн на камунальныя паслугі, міграцыйны крызіс і — правальнае для дзейнай улады заканчэнне мясцовых выбараў.

У той жа час нельга сказаць, што кіраўніцтва не разумее ці не ведае, да чаго ўжо прывяла такая бяздумная палітыка. На Сусветным эканамічным форуме ў Давосе ў студзені 2025 года старшыня ЕК Урсула фон дэр Ляен адзначыла, што «здабыццё свабоды ад расійскіх энергарэсурсаў каштавала Еўрапейскаму саюзу вельмі дорага».

Паводле ацэнак Міжнароднага валютнага фонду (МВФ) і еўрапейскай статслужбы (Eurostat), у перыяд з 2022 да 2024 года краіны ЕС пераплацілі каля 544 мільярдаў еўра за імпарт больш дарагіх энергарэсурсаў. А з улікам ускосных эфектаў, такіх як зніжэнне прадукцыйнасці, рост беспрацоўя і агульнае запаволенне эканамічнай актыўнасці, страты эканомікі ЕС аказаліся яшчэ больш значнымі. Сумарныя страты перавысілі 1,3 трыльёна еўра, што складае прыкладна 2,4 % ад меркаванага росту ВУП. Не засталіся ўбаку і шараговыя еўрапейцы. У выніку зніжэння даходаў кампаній і агульнага пагаршэння эканамічнай сітуацыі звычайныя грамадзяне недаатрымалі каля 1,6 трыльёна еўра даходаў, што эквівалентна 6,3 % ад агульнага аб'ёму аплаты працы за мінулы перыяд.



У заключэнне хацеў бы звярнуць увагу на яшчэ адну крыніцу ў замежных СМІ. У студзені 2022 года шведская газета Nya Dagbladet («Новая штодзённая газета») апублікавала сакрэтны мемарандум («Executive summary») з даклада «Вытрачванне Амерыкі за кошт аслаблення Германіі», падрыхтаванага аналітыкамі амерыканскай карпарацыі RAND Co. па замове Дзярждэпа ЗША. У дакуменце адкрыта гаворыцца пра рэальныя планы амерыканскай адміністрацыі адносна Еўропы.

Павелічэнне патоку рэсурсаў і капіталаў з Еўропы ў ЗША можна чакаць толькі ў тым выпадку, калі Германія апынецца ў сітуацыі эканамічнага крызісу. Паколькі яе эканоміка залежыць ад неабмежаванага доступу да расійскіх энергетычных рэсурсаў, крызіс можна справакаваць, пазбавіўшы яе доступу да іх. Адзіны рэальны спосаб гарантаваць адмову Германіі ад расійскай энергіі і рынку — гэта ўцягнуць абодва бакі ў супрацьстаянне. Цытата: «Нашы далейшыя дзеянні (нашы — гэта амерыканскія) у гэтай краіне (аграрайце, якой) непазбежна прывядуць да адказу з боку Расіі. Руская не толькі не змогуць пакінуць без адказу масіраваны ціск на непрызнаныя рэспублікі, але іх можна будзе аб'явіць вінаватымі і ўвесці супраць іх поўны пакет санкцый. Тады Пуцін можа ў адказ увесці контрсанкцыі. Перш за ўсё на пастаўку энергіі ў Еўропу. Урон, нанесены краінам ЕС, будзе параўнальны са стратамі для РФ, а для Германіі ён будзе яшчэ большы». Рэалізацыя гэтага плана дазволіць ЗША пазбегнуць крызісу і ўжо ў сярэднетэрміновай перспектыве, ад 4 да 5 гадоў, перанакіраваць патокі капіталаў з Еўропы ў ЗША. У выніку амерыканская эканоміка зможа атрымаць дадатковы даход у $7-9 трлн. Тры гады, якія мінулі з моманту дадзенай публікацыі, пацвярджаюць не толькі яе праўдзівасць, але і сведчаць аб рэальным стаўленні ЗША да сваіх саюзнікаў.

Такім чынам, думка, што сёння Еўропа практычна цалкам амерыканізавана і знаходзіцца пад знешнім кіраваннем з боку Вашынгтона, не пазбаўлена падстаў. А рыторыка Трампа ў адрас як чыноўнікаў ЕК, так і асобных кіраўнікоў краін ЕС з'яўляецца толькі лагічным працягам існага «status quo».

**Георгій ГРЫЦ,**
**кандыдат эканамічных навук.**

### Даведка

*Па выніках першых трох месяцаў 2025 года, міністр эканомікі ФРГ Роберт Хабек паведаміў: нямецкая эканоміка сёлета не зможа прадэманстраваць нават мінімальнага росту. Раней, у студзені, урадавыя эканамісты меркавалі, што ў 2025-м магчыма нязначнае павелічэнне ВУП Германіі на 0,3 %.*


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

на 16.05.2025 г. в 11.00 по адресу: 230005, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87, каб. № 204,
по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на **пять лет** для производственных целей (за исключением вредных производств), складских помещений, оказания услуг.

***Организатор аукциона – РУП «Белтелеком» в лице Гродненского филиала, 230005, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87***

| Адрес арендуемого имущества | № Лота | Площадь, кв. м | Коэффициент от 0,5 до 3,0 | Начальная цена продажи, руб. | Размер задатка, руб. | Характеристика |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Капитальное строение, автоматическая телефонная станция – 5, 1-й этаж, помещения, в т. ч. вспомогательное помещение (коридор), Гродненская обл., г. Гродно, ул. Репина, 38 | 1 | 189,5, в т. ч.: 181,8; 5,4; 2,3 | 1,0 | 841,38 | 841,38 | Помещения находятся на первом этаже двухэтажного железобетонного здания. В помещении имеется естественное освещение, отопление, электроснабжение. В здании имеется автономное отопление, водоснабжение, канализация, телефонизация. Здание находится на расстоянии 4,8 км от автовокзала. К зданию организованы удобные подъездные пути. Площади находятся в удовлетворительном состоянии, не используются с ноября 2024 года |
| Изолированное помещение, помещение связи, 5-й этаж, помещение, Гродненская обл., г. Гродно, ул. Пестрака, 36-11 | 2 | 35,9 | 1,0 | 159,40 | 159,40 | Помещение находится на пятом этаже пятиэтажного кирпичного здания. В здании имеется электроснабжение, отопление, водоснабжение, канализация, телефонизация. Здание находится на расстоянии 4,1 км от автовокзала. К зданию организованы удобные подъездные пути. Помещение находится в удовлетворительном состоянии, не используется с ноября 2024 года |
| Изолированное помещение, помещение связи, 5-й этаж, помещение, Гродненская обл., г. Гродно, ул. Пестрака, 36-11 | 3 | 26,9 | 1,0 | 119,44 | 119,44 | Помещение находится на пятом этаже пятиэтажного кирпичного здания. В здании имеется электроснабжение, отопление, водоснабжение, канализация, телефонизация. Здание находится на расстоянии 4,1 км от автовокзала. К зданию организованы удобные подъездные пути. Помещение находится в удовлетворительном состоянии, не используется с ноября 2024 года |
| Изолированное помещение, помещение связи, 2-й этаж, помещение, Гродненская обл., г. Гродно, ул. Пестрака, 36, пом. 7 | 4 | 16,2 | 1,0 | 71,93 | 71,93 | Помещение находится на втором этаже пятиэтажного кирпичного здания. В здании имеется электроснабжение, отопление, водоснабжение, канализация, телефонизация. Здание находится на расстоянии 4,1 км от автовокзала. К зданию организованы удобные подъездные пути. Помещение находится в удовлетворительном состоянии, не используется с ноября 2024 года |

Порядок проведения и оформления участия в аукционе определен Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607).

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, представившие организатору следующие документы: представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность, заявление на участие в аукционе, заявление об ознакомлении с документами, порядком проведения аукциона, соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заверенную банком копию платежного документа, о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона, документ, удостоверяющий личность (для физических лиц, для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) (для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц резидентов Республики Беларусь), легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения (для юридических лиц нерезидентов Республики Беларусь). Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

*Задаток перечисляется на субсчет BY16AKBB30120000400714000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBB BY2X Гродненский филиал РУП «Белтелеком».*

Участники аукциона уплачивают штраф в случаях, предусмотренных частью второй пункта 14 Положения «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607), в размере 15 % от начальной цены продажи соответствующего лота.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

Прием документов на участие в аукционе осуществляется по адресу: 230005, г. Гродно, ул. Максима Горького, 87, каб. 407 **с 06.05.2025 по 15.05.2025 г. включительно** в рабочие дни (с 9.00 до 16.00). Документы, поданные **после 16.00 15.05.2025 г.** не рассматриваются.

**Телефоны для справок: (0152) 606805, (0152) 555138, факс (0152) 555139**

# ПАЛЯНА ПЕРАМОГІ, ПОЛЕ НАРЦЫСАЎ І УСХОДНІ САД

## Новыя рэкрэацыйныя магчымасці батанічнага саду

Напярэдадні Дня Перамогі супрацоўнікі Цэнтральнага батанічнага саду НАН Беларусі зрабілі мінчанам і гасцям сталіцы незвычайныя падарункі — адкрылі новыя лакацыі, дзе прадстаўлены ўнікальныя віды раслін, скульптурныя і ландшафтныя кампазіцыі.





Устаноўленая летась да 80-годдзя вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на Паляне Перамогі скульптура «Галубы міру», як расказаў **вучоны сакратар Цэнтральнага батанічнага саду НАН Беларусі Павел БЕЛЫ,** будзе дапоўнена фігурай хлопчыка, які выпускае голуба. А ў перспектыве кампазіцыю завершыць скульптура дзяўчынкі. Аўтарам пластычнага твора з'яўляецца супрацоўнік батсаду скульптар Вадзім Мацкевіч.

Размешчанае непадалёк поле мясцовыя работнікі называюць «маленькай Галандыяй». І гэта невыпадкова. Нарцысы больш чым 100 сартоў розных формаў і расфарбовак цешаць наведвальнікаў сваёй пышнасцю. Усяго ж у калекцыі батанічнага саду налічваецца 436 сартоў гэтых кветак, і таму кожную вясну «маленькая Галандыя» прыгожая па-свойму, ніколі не паўтараецца.

Крыху далей на фоне нашых родных бяроз і соснаў вылучаецца нязвыклая форма чырвонай брамы Торыі і сілуэт доміка ва ўсходнім стылі. Звычайна ў еўрапейскіх гарадах такія прыродныя куткі называюць японскім садам. Але Галіна Валіцкая, ландшафтны архітэктар і адзін з аўтараў праекта, сцвярджае, што ў нашым выпадку правільна ўсё ж называць Усходні сад. У калекцыі экспазіцыі прадстаўлена больш як 300 відаў раслін, радзімай якіх з'яўляецца Далёкі Усход і краіны Паўднёва-Усходняй Азіі.

Спецыялісты праекта высаджваюць расліны такім чынам, каб у выніку ўсё выглядала натуральна ў адным стылі і сузіранне выклікала супакаенне. Гэтай канцэпцыі ў поўнай меры адпавядае водны каскад з трох чашаў. Струмені вады, якія пераліваюцца, — гэта не толькі чароўнае відовішча, але і жаданая крыніца вады ў спякотныя дні для птушак, якімі можна палюбавацца, седзячы побач на лаўцы ў цяньку. Што да чайнага доміка, то пакуль ён пабудзе проста характэрным элементам экспазіцыі. Але ў перспектыве, магчыма, там пачнуць праводзіць чайныя цырымоніі.

**Андрэй САКАЛОЎ,**
**фота аўтара.**


## Извещение о проведении 28 мая 2025 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
| --- |
| Капитальное строение с инв. номером 630/С-47149 общей площадью 647,0 кв. м (наименование – Административное здание; назначение – здание административно-хозяйственное; составные части и принадлежности: бетонный подвал); капитальное строение с инв. номером 630/С-47154 общей площадью 397,2 кв. м (наименование – Склад материальный; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-47152 общей площадью 222,7 кв. м (наименование – Склад для горюче-смазочных материалов; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-47155 общей площадью 743,1 кв. м (наименование – Боксы для автомашин с пристройкой подсобных помещений; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47160 общей площадью 1960,9 кв. м (наименование – Ремонтные мастерские; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47158 общей площадью 1360,7 кв. м (наименование – Пристройка к реммастерским; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47156 общей площадью 1123,1 кв. м (наименование – Боксы для автомашин; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-55558 общей площадью 35,0 кв. м (наименование – Навес под баллоны; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-55622 (наименование – Ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение из силикатного кирпича (1,95 м х 2,34 м х 0,25 м), площадью 4,6 кв. м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55620 (наименование – Ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение из металлической арматуры (21,0 м х 2,69 м), площадью 56,5 кв. м, на металлических столбах (0,1 м х 2,60 м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55611 (наименование – Ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1.1. – ограждение из силикатного кирпича (13,94 м х 2,85 м х 0,25 м), 39,7 кв. м, а1.2. – ворота металлические (4,07 м х 2,85 м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55610 (наименование – Ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение бетонное (97,5 м х 1,71 м), 166,7 кв. м с 31 кирпичными столбиками с бетонными оголовками; а.1.1. – металлическая решетка (1,50 м х 1,97 м), 41,37 кв. м; а2 – ворота металлические (5,96 м х 3,70 м), 22,1 кв. м; а2.1. – калитка металлическая (1,62 м х 2,30 м), 3,73 кв. м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55608 общей площадью 7260,0 кв. м (наименование – Площадка; назначение – сооружение неустановленного назначения; составные части и принадлежности: а1 – площадка из асфальтобетона); капитальное строение с инв. номером 630/С-55607 общей площадью 465,0 кв. м (наименование – Площадка; назначение – сооружение неустановленного назначения; составные части и принадлежности: а1 – площадка из бетонной плитки); оборудование котельной с инв. номером 146 (котел КВЖ-02, 2 шт.; циркуляционный насос, 4 шт.; бойлер 10 м. куб. 1 шт.; топливопровод 20 м; щит управления) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 1,331 га, кадастровый номер – 642000000002000230 |
| Местонахождение: Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Замковая, 33 |
| Начальная цена: 1 363 662,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 136 000,00 бел. руб. |
| Обременение: аренда |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **28 мая 2025 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с **07.05.2025 по 27.05.2025** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефонам: **(017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

**Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**



УНП 193734126

## ООО «СидНеА» организует конкурсные торги

| Дата и время проведения | Предмет (право на заключение договоров купли-продажи/аренды) | Начальная цена: сумма в белорусских рублях, эквивалентная долларам США по курсу НБ РБ на день проведения торгов | Общая площадь | Конкурсное обеспечение в бел. руб. | Срок заключения договора купли-продажи/аренды |
| --- | --- | --- | --- | --- | --- |
| **04.06.2025 10.00** | Продажа дома с кадастровым номером 622285501101000122, по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, д. Василевщина, ул. Центральная, д. 37А | 210000 | 140,3 кв. м | 2500 | 90 |
| | **Повторные конкурсные торги** | | | | |
| **04.06.2025 11.00** | Продажа дачного дома с инв. № 614/С-41474 по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Усяжский с/с, СТ «Чайка-81», д. 45 | 34900 | 47,7 кв. м | 2500 | 90 |
| **04.06.2025 11.30** | Продажа квартиры с инв. № 600/D-123491 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Слободщина, ул. Славянская, д. 23, кв. 1 | 169900 | 150,5 кв. м | 2500 | 90 |
| **04.06.2025 12.00** | Продажа участка с кад. ном. 624882000055000114 по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Заболотский с/с, СТ «Стрелец-2014», 90 | 18900 | 0,1044 га | 2500 | 90 |
| **04.06.2025 12.30** | Продажа дома с кадастровым номером 624882000055000178 по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Заболотский с/с, СТ «Стрелец-2014», 33 | 134900 | 0,1053 га | 2500 | 90 |
| **04.06.2025 13.00** | Продажа квартиры с инв. № 500/D-708156986 по адресу: г. Минск, тр-т Сморговский, д. 3, кв. 96 | 129900 | 67,9 кв. м | 2500 | 90 |
| **26.05.2025 13.00** | Продажа квартиры с инв. № 600/D-52768 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, аг. Лесной, ул. Н. Н. Александрова, д. 6, кв. 41 | 61500 | 37,4 кв. м | 2500 | 90 |
| | **Изменение цены по объекту, опубликованному в газете «Звязда» № 74(30426) от 16.04.2025** | | | | |
| **15.05.2025 11.00** | Продажа дачного дома с инв. 600/С106054 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Петришковский с/с, СТ «ЛУКОМОРЬЕ», д. 18 | 17500 | 63,8 кв. м | 2500 | 90 |

Торги состоятся по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7 этаж.
Срок внесения конкурсного обеспечения и приема заявлений с прилагаемыми к нему документами прекращаются за один рабочий день до проведения торгов по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7 этаж.
Конкурсное обеспечение вноситься на р/с BY14MTBK30120001093300123688 в ЗАО «МТБанк», БИК (код) MTBKBY22.
Победитель торгов в день проведения подписывает протокол о результатах торгов.
Иные условия проведения объявленных конкурсов: право подачи и подписания заявления о государственной регистрации договора купли-продажи и основанных на нем прав предоставляется покупателю. Лицо, выигравшее торги, определяется в соответствии с правилами проведения конкурсов по продаже (аренде) имущества ООО «СидНеА», утвержденным приказом директора от 05.03.2024 № 9-ОД.
Организатор вправе отказаться от конкурсов (повторного конкурса) в любое время до начала торгов.
Телефон для справок (+37529) 171-50-50.

Дзяніс ВАСІЛЕВІЧ:

# «МЫ НЕ ЗДАЁМСЯ, У НАС ПРОСТА НЯМА ТАКОЙ МАГЧЫМАСЦІ»

## Як гісторыя аднаго чалавека змяніла жыцці дзясяткаў людзей

**Гэта той самы выпадак, калі журналісцкая аб'ектыўнасць і непрадузятасць адыходзяць на другі план. Таму што непрадузята ставіцца да дабрыні, неабыякавасці і рэальнай дапамогі людзям проста немагчыма. А яшчэ гэта вельмі незвычайная і нават кранальная гісторыя.**



Дзяніс Васілевіч увесь свой час прысвячае дапамозе людзям з інваліднасцю. Інакш ён не можа. Мама Дзяніса — унікальная жанчына. Яна з'явілася на свет без рук і ног, але змагла нарадзіць, выхаваць сына і навучыцца весці актыўнае жыццё. За гэтым стаіць вялізная праца і шалёная ўпартасць. А ў большасці людзей з інваліднасцю, асабліва калі яна набытая, не заўсёды ёсць разуменне, як адаптавацца да новай рэальнасці. Але ў іх ёсць Дзяніс Васілевіч — валанцёр-інструктар па фізічнай падрыхтоўцы ў Рэспубліканскай асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў (РАІК), ініцыятар розных сацыяльных праектаў. Адзін з іх, напрыклад, інклюзіўны пляж на Мінскім моры. У працэсе рэалізацыі «ідэя фікс» — першы ў краіне інклюзіўны картынг. «З прычыны медыцынскіх паказанняў не ўсе могуць кіраваць аўтамабілем, атрымаць правы. А мы абсталюем картынг так, што людзі з рознымі формамі інваліднасці змогуць гэта рабіць. Магчыма, такім прыкладам мы дадзім штуршок змяненням у звычайных аўтамабілях, каб імі маглі кіраваць людзі з інваліднасцю», — тлумачыць Дзяніс.

А яшчэ Дзяніс Васілевіч — трэнер па лёгкай атлетыцы. Трэніруе, як няцяжка здагадацца, спартсменаў з паражэннямі апорна-рухальнага апарату. Сам ён, дарэчы, у мінулым спартсмен, займаўся веславаннем, скончыў Рэспубліканскае дзяржаўнае вучылішча алімпійскага рэзерву, атрымаў дыплом трэнера... і паклаў яго на паліцу. Там дыплом і ляжаў амаль 10 гадоў, пакуль у 2015-м у адным з лагераў актыўнай рэабілітацыі ад РАІК Дзяніс Васілевіч не пасябраваў з Уладзіславам Грыбам. Хлопец зламаў пазваночнік, пасля рэабілітацыі заняўся лёгкай атлетыкай, і спатрэбілася дапамога сябра з трэнерскай адукацыяй. Адмовіць таварышу Дзяніс Васілевіч не змог. Уладзіслаў Грыб кідае булаву. Да яго ніхто з беларускіх паралімпійцаў з гэтым снарадам не працаваў. Таму сябрам прыйшлося ўсяму вучыцца на ўласным досведзе. «Булаву кідае самы складаны клас — людзі з траўмай шыі, у якіх дрэнна працуюць рукі і ногі. Слабы хват рук, слабая спіна, абмежаваныя кручэнні — усё гэта мае месца быць. І далёка не ўсе трэнеры могуць ці жадаюць працаваць з такімі спартсменамі. Я ведаю, як з імі працаваць, я разумею спецыфіку траўмаў. Таму мне было цікава прыняць гэты выклік. Булава — вельмі нестандартны снарад. Ёсць пэўныя патрабаванні, якой яна павінна быць па памеры — не больш за 38 см, па вазе — 397–420 грам. А ў астатнім ты чараўнік сваёй булавы. За паўтара года работы Улад дадаў да свайго выніку каля чатырох метраў — гэта красамоўны паказчык таго, што мы ўсё зрабілі правільна, падабралі найбольш падыходзячы снарад», — распавядае Дзяніс.

Пасля гэтага з'явіліся яшчэ ахвотныя паспрабаваць сябе ў кіданні булавы. Але, тлумачыць Дзяніс, далёка не ва ўсіх функцыянальныя магчымасці арганізма дазваляюць гэта рабіць. «Мы не проста набіраем людзей, мы іх адбіраем, глядзім на фізічны стан, узрост. Таму што паралімпійскі спорт — гэта не хобі, гэта прафесійны спорт і падрыхтоўка ў нас прафесійная», — адзначае трэнер. Некаторы час Уладзіслаў Грыб быў адзіным кідальнікам булавы ў краіне. Але нядаўна ў іх групе з'явіўся яшчэ адзін спартсмен з аналагічнай траўмай — Андрэй Бабінскі. А, значыць, можна казаць аб унутранай канкурэнцыі, якая ідзе на карысць спартсменаў. «Кіданне булавы — вельмі перспектыўны кірунак. У яго развіцці я бачу дзве мэты. Першая — інтэграцыя ў спартыўную супольнасць людзей з траўмай шыі, ім даступна не так шмат відаў спорту. Другая — медалі для краіны. Мы на гэта здольныя, мы да гэтага імкнёмся», — дзеліцца Дзяніс Васілевіч. Цяпер пад яго кіраўніцтвам трэніруецца пяць спартсменаў: Юлія Няжура кідае кап'ё і штурхае ядро, Анатоль Церахаў, у чыім арсенале булава, ядро і кап'ё, Ірына Бараноўская, у якой асноўны від — кіданне дыска і дадатковы — штурханне ядра.

Галоўны прынцып Дзяніса Васілевіча як трэнера — быць адным цэлым са сваімі спартсменамі. «Я лічу, што калі атлет робіць усё, як я яму кажу, значыць, за вынік мы павінны адказваць разам. Ён выконвае тое, што я бачу, рэалізуе мае ідэі, і калі нешта ідзе не так, значыць, ёсць і мая недапрацоўка. Таму ўсё, што мы робім, мы робім разам і адказваем за гэта таксама разам. Практыка паказала, што такі падыход дзейнічае», — тлумачыць трэнер. І яшчэ, паводле яго меркавання, вельмі важна размяжоўваць сяброўства і работу, як у выпадку з Уладзіславам Грыбам: «Калі мы заходзім у сектар, я — на рабоце, ён — на трэніроўцы. У жыццёвых пытаннях ён можа не прыслухоўвацца да маіх парад, але ў плане работы гэта немагчыма. У нас увесь час адбываюцца дыскусіі, таму што Улад — чалавек з характарам, і я як прафесіянал не магу гэта не ўлічваць. Я заўсёды даю магчымасць зрабіць па-свойму і паглядзець, што з гэтага выйдзе. Калі прапановы спартсменаў лепшыя, вядома, я іх прымаю».

У 2024 годзе Уладзіслаў Грыб і Дзяніс Васілевіч выступалі на Паралімпійскіх гульнях у Парыжы. Для спартсмена гэта была ўжо другая Паралімпіяда, для трэнера — першая. «Калі я сам быў спартсменам, вядома, я марыў выступіць на Алімпійскіх гульнях. Мара спраўдзілася крыху інакш: я стаў трэнерам і выступіў на Паралімпійскіх гульнях. Я не падзяляю Алімпійскія і Паралімпійскія гульні. Гэта галоўны старт, той жа маштаб і таксама вялікае значэнне. Адказнасць перад краінай, перад тымі, хто ў нас верыў і хто нам дапамагаў, — каласальная. І пры гэтым трэнеру трэба быць стрыманым, таму што калі я пакажу сваё хваляванне, яно перадасца і спартсмену», — разважае Дзяніс Васілевіч. На жаль, у Парыжы ім не ўдалося дасягнуць жаданага выніку, Уладзіслаў Грыб і Дзяніс Васілевіч занялі шостае месца. «Пасля выступлення мы два дні не размаўлялі. Я палічыў, што трэба вытрымаць паўзу, каб не пагоршыць. Мы ехалі туды па медаль. Улад мог бы яго ўзяць, пасля Паралімпіяды ён кінуў па выніку трэцяга месца. Мы, мусіць, да канца і сёння не прынялі ўсё, што здарылася ў Парыжы, але мы зразумелі свае памылкі і выправілі іх. Так, гэта сумны досвед, аднак трэба працаваць далей. У такіх сітуацыях шмат залежыць ад трэнера: данесці, пераканаць, зрабіць высновы і настроіць на далейшую працу. Спартсмен павінен змагацца, а трэнер павінен яму падказваць, як гэта рабіць. Дай бог, Паралімпіяда ў Лос-Анджэлесе нам скарыцца. Цяпер Уладу не хапае вялікай, важнай перамогі. Калі ён яе возьме — ужо нікому не аддасць. А пакуль што трэба для яе працаваць. Значыць, такі наш лёс. Мы не здаёмся, у нас проста няма такой магчымасці», — разважае Дзяніс Васілевіч.

Трэнер прызнаецца, яго дзейнасць — няпростая, але інакш ужо нельга: «У мяне былі спробы завязаць з валанцёрствам. У нейкі момант прыходзіш да пункта невяртання, калі здаецца, што ўжо ўсё зрабіў і сіл, і ідэй больш не застаецца. Але праходзіць час, выдыхаеш, і з'яўляюцца новыя ідэі. Я з дзяцінства вяду такі лад жыцця, жыў сярод інвалідаў і разумею: а хто, калі не я? Таму раблю, іншыя глядзяць і падцягваюцца. І гэта класна. Хочаш змяніць свет — пачні з сябе».

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
### по продаже права заключения договоров аренды открытых площадок с покрытием

| | | | |
|---|---|---|---|
| Организатор аукциона | Открытое акционерное общество «Солигорскторг», г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44 | | |
| Дата, время и место проведения аукциона | 15.05.2025, 12.00, актовый зал ОАО «Солигорскторг» | | |
| | Лот № 1 | Лот № 2 | Лот № 3 |
| Предмет аукциона | Право заключения договора аренды открытой площадки с покрытием | Право заключения договора аренды открытой площадки с покрытием | Право заключения договора аренды открытой площадки с покрытием |
| Общая площадь, кв. м | 10 | 60 | 72 |
| Местонахождение недвижимого имущества | Минская область, г. Солигорск, ул. Октябрьская, 85, район магазина № 23 | Минская область, г. Солигорск, ул. К. Заслонова, 63, район магазина № 35 | Минская область, г. Солигорск, ул. К. Заслонова, 63, район магазина № 35 |
| Целевое использование имущества | Организация деятельности в соответствии с законодательством Республики Беларусь, санитарными нормами и противопожарными требованиями, для размещения нестационарного торгового объекта по реализации плодоовощной продукции | Организация деятельности в соответствии с законодательством Республики Беларусь, санитарными нормами и противопожарными требованиями, для размещения детских аттракционов | Организация деятельности в соответствии с законодательством Республики Беларусь, санитарными нормами и противопожарными требованиями, для размещения нестационарного объекта общественного питания |
